# ЗМЕСТ

Трэцяя ракета . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

Праклятая вышыня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 161

Дажыць да світання . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 287

# 1

Я ляжу ў акопе на разасланым шынялі і доўга гляджу ўгору, у сінюю бездань летняга неба. На паверхні ціха — ні стрэлу, ні выбуху, наўкола ўсе спяць; трохі далей, ля снараднай нішы, нехта моцна сапе, здаецца, вось-вось пяройдзе на храп. Дзень стаіць ветраны, спёка не дужа вялікая, сонца схавалася за бруствер і кіруе ўжо на захад. На беражку акопа матляецца-ляскоча аб высахлы ком чарназёму нейкая былінка, а над усім гэтым высока ў небе лётаюць буслы. Дзве вялізныя птахі, распластаўшы крылы, узнімаюцца ў самую высь і кружацца там, бы купаюцца ў сонечнай раздольнай прасторы. Ветраныя патокі, відаць, патроху адносяць іх убок, за камкаваты акопны бруствер, але яны, лена і важна перабраўшы крыламі, зноў вяртаюць сабе ранейшую вышыню і кружаць, кружаць там доўга.

Буслы часта з'яўляюцца тут у сонечныя надвячоркі, лятаюць і кружацца, пэўна, выглядаючы дзе якую балацявіну, трысняговую старыцу, лужок, каб палавіць спажывы, напіцца, а то і проста па буслінаму звычаю пастаяць у роздуме на адной назе. Але цяпер яны нікуды не могуць спусціцца, бо скрозь — ля старыц, у прырэчных балацявінах, на ўсіх лужках і дарогах — людзі. Не спраўляюцца буслы нагледзець што здатнае, як на зямлі пачынаюць грукатаць стрэлы — недзе там, у ветранай прасторы, злосна фыркаюць нябачныя чмялі-кулі, буслы палахліва кідаюцца прэч — адлятаюць на захад, некуды ў бок недалёкіх Карпат.

Без буслоў бяздоннае сіняе неба становіцца пустым і нецікавым, у ім няма на чым зачапіцца позірку, я прыжмурваюся і дрымотна прыціхаю...

Раптам на брустверы над маёй галавой нешта гучна лопае, бы хто ляскае дубцом па ссохлай пыльнай зямлі, — і я прахопліваюся са сваёй санлівай задумы. У акопе па-ранейшаму ціха, усе спяць, толькі на прыступках туліцца пад брустверам Лёшка Задарожны, наш зараджаючы. Ён у адной, вельмі заношанай, нацельнай сарочцы з матузамі-завязкамі на грудзях; голыя да локцяў, ушчэнт статуіраваныя рукі камечаць зашмальцаваную гімнасцёрку, на якой вісіць канец новага недашытага каўнерыка. Хітраватыя Лёшкавы вочы на круглявым брывастым твары няўцям міргаюць, як гэта бывае ў чалавека, які зрабіў нейкае глупства.

— Сабака! — невядома да каго кажа Лёшка. — Глядзі ты! Я ж цябе падражню...

Ён кладзе на прыступкі сваю гімнасцёрку са свежаначышчаным гвардзейскім значком і хапае рыдлёўку, што стаіць побач. Я яшчэ не цямлю, што здарылася, як Лёшка, дурасліва ўхмыляючыся ўсім сваім поўным, паголеным — увогуле прыгожым — тварам, ціхенька вытыркае з-за бруствера точаны чаранок рыдлёўкі.

«Чвік!» — і на брустверы ўшчэнт разлятаецца вялікая ўсохлая груда.

Лёшка каратка ўздрыгвае, але свавольна ўхмыляецца і, заўважыўшы, што я згледзеў ягоны занятак, ужо смялей высоўвае з акопа рыдлёўку. Недзе ў варожым баку слаба ка́хае стрэл, і тут жа новая куля адшчэпвае ад чаранка тоўстую трэску.

— Не псуй рыдлёўкі! — кажу я Лёшку. — Знайшоў занятак.

— Ерунда там рыдлёўка! Я ўжо яго падражню, сабаку!..

І ён зноў выторквае рыдлёўку, але зараз жа хавае яе, і ў той жа час выразна чуецца «чвік», «чвік» — з бруствера пырскае зямля.

— О, о, законна! Пазлуйся, пазлуйся, — задаволена кажа Лёшка, забаўляючыся з рыдлёўкай. Ён і яшчэ хоча нешта сказаць, але толькі раскрывае рот, як устаялая ціш над акопам узрываецца траскучым грукатам разрыўной буйнакаліберна чаргі. Пясок, груды і ашмоцце кукурузы з бруствера разлятаюцца ў бакі, абсыпаюць твары, галовы, спіны сонных людзей у акопе. Але чарга кароценькая; нарабіўшы вялікага грукату, яна раптам сціхае, і вецер паволі здзьмухвае з бруствера пыл.

— Што гэта? Што такое? Свінячае рыла! — крычыць з канца акопа наш камандзір Жаўтых. Ён, як і ўсе, прахопліваецца са сну, і, напэўна, нейкае камандзірскае адчуванне падказвае яму, што хтось правінаваціўся. Прыгнуўшыся, без папругі, у расшпіленай гімнасцёрцы, на якой пагойдваецца паўтузіна медалёў, ён цераз людскія целы пералазіць па акопу да Лёшкі.

— Табе што?.. Цесна ў акопе? — пытаецца старшы сяржант і строга глядзіць на Лёшку. Той, не варухнуўшыся, сядзіць у доле, абсыпаны зямлёй, і, паказваючы свае прыгожыя здаровыя зубы, нахабнавата ўхмыляецца.

— Нейкі Ганс ледзьве іголкі з пальцаў не выбіў, зараза!..

— Іголку ў яго не выбіў! Ты што — малалетак? Сысунок? Растлумачыць табе, што да чаго? Футбаліст мне!

З хвіліну Жаўтых злосна пазірае зверху ўніз на Лёшку, але скрозь усё ціха, і старшы сяржант, супакойваючыся, пачынае абтрэсваць з вусоў і галавы пясок. Потым ён пераводзіць свой яшчэ незадаволены позірк на нас, яго падначаленых. Вочкі ў яго маленькія, няпэўнага выцвілага колеру, яны хаваюцца пад налахмачаныя строгія бровы, і пажылы ўжо, сіні, пабіты порахам твар яго не абяцае дабра.

— Чаго разлёгся? — буркатлівым, глухаватым голасам гыркае ён на мяне. — Курорт табе, такую матары! Ану, марш назіраць!

Я пачынаю ўставаць з шыняля, у душы лаючы Лёшку за яго недарэчныя жарты з немцамі, а камандзір тым часам стаіць і азірае іншых.

# 1

Мы наступалі.

Надвор'е выдалася такое, што горш не прыдумаеш: увесь дзень ішоў дождж напалам са снегам. Не падсохлая яшчэ ад вясновага разводдзя зямля зусім раскісла, гразь на дарозе перамяшалася са снегавой кашай, у якой агідна хлюпалі нашыя змакрэлыя ногі. Пад вечар да таго ж усчаўся напорысты, віхурны вецер. Увесь час мяняючы кірунак, ён апантана круціў над шляхам. Наперад часам немагчыма было зірнуць — золкая снегавая макрэдзь сляпіла вочы. Угнуўшы галаў, я бачыў толькі, як мільгалі заляпаныя гразёй кірзачы камандзіра роты Ананьева; мокрая плашч-накідка на ягонай спіне надзімалася крутым пухіром, камроты ўгінаўся, хапаючыся рукой за капюшон, накінуты на самаробную, з мацерчатым казырком фуражку, і, злосна мацюкнуўшы Бога і надвор'е, рашуча крочыў па гразкай дарозе. Перакураў мы не рабілі.

Калі пачало змяркацца і раскіслы, у лужынах, прасёлак завярнуў на касагор, Ананьеў павярнуўся тварам да калоны і нейкае паўхвіліны прайшоў так, задам наперад. Ён зіркаў на строй, хоць, мусіць, не шмат што ўбачыў на прыцьмелай дарозе. Рота расцягнулася, і старшы лейтэнант, моршчачы хударлявы, з бачкамі на шчоках твар, нягучна паклікаў:

— Старшына Піліпенка!..

Аднак Піліпенка, мабыць, не чуў і засяроджана брыў у непагодным паўзмроку акрай дарогі.

— Глушэц стары! — буркнуў Ананьеў. — Заснуў, мабыць.

Не чакаючы ягонага загаду, я выйшаў з калоны і хуценька падбег да старшыны. Піліпенка няўцямна ўскінуў насустрач немалады ўжо, не чыста голены і крыху брузглаваты твар, але тут жа згледзеў наперадзе цыбатую постаць камандзіра роты і ўсё зразумеў адразу. Са спазнелай паспешнасцю старшына крутануўся да свайго ўзвода (строй якога быў даволі бязладны, болей дакладна — не было ніякага строю). Разбрыўшыся па дарозе, аўтаматчыкі зморана валакліся ў прыцемках — хто бокам, хто ўгнуўшы галаў, а хто і адвярнуўшыся ад напорыстых парываў ветру. Брылі, дзе каму здалося зручней: па ўзбочыне, па-над шырокай, поўнай снегавой слоты канавай і нават за канавай — па краі аблепленага мокрым снегам палетка.

Пазнавата спахапіўшыся, Піліпенка сцішаным голасам, каб не пачуў камроты, пачаў падганяць байцоў. Трое ці чацвёра пярэдніх заварушыліся жывей або, можа, зрабілі выгляд, што заварушыліся, іншыя ж проста пакінулі без увагі яго каманду-прынуку. Вядома, прамінуць такое камандзір роты не мог і, са злой цікаўнасцю сочачы за марнымі намаганнямі ўзводнага, выйшаў на ўзбочыну.

— Ану, варухні нагой, ядрона вош! Жыва мне!

Камроты — не ўзводны. Аўтаматчыкі паскорылі крок, заднія пусціліся нават подбегам, усе прыкметна заварушыліся. Ананьеў болей не падганяў, толькі пачакаўпамарудзіў з прыдзірлівай строгасцю на худаватым насупленым твары, і строй памалу пачаў выроўнівацца.

Тым часам Піліпенка сышоў на ўзбочыну і пакорна спыніўся збоч ад камандзіра роты. Той, безуважны, аднак, да старшыны, зноў гукнуў у калону:

— Ваніна ка мне!

Каманду ўраз падхапілі, перадалі далей, — камроты цярпліва прасачыў за гэтым, прыдзірліва ўзіраючыся ў валюхастыя постаці сваіх аўтаматчыкаў. Ён чакаў камандзіра другога ўзвода, але замест яго на дарозе з’явілася Пулька,

маленькае вяртлявае сабачанё, якое тыдзень назад аднекуль прыбілася да роты і якое прытуліў у сваім узводзе малодшы лейтэнант Ванін. Ананьеў выказаў цярплівасць, нават нейкую да часу затоеную цікаўнасць да гэтага, і вось ужо некалькі дзён другі ўзвод забаўляўся з гэтым кудлатым, па-маладому гарэзлівым шчанюком.

Пулька з рухавай бесклапотнасцю прабегла краем дарогі, але раптам згледзела камандзіра роты, нібы зразумеўшы штось, гаўкнула і кінулася назад да Ваніна. Баец у доўгай палатцы, рог якой валокся па гразі, знарок тупнуў ботам — снегавое слізгоцце з-пад ног шырока пляснула на сабачанё, тое крыўдліва віскнула і кінулася за канаву. Аднак канава тут была шырэй, чым здалося: Пулька да жывата праваліліся ў снег, распырскваючы слоту, выскачыла на той бок і трывожна замітусілася, не ведаючы, як выбрацца на дарогу.

Ванін прыпыніў бег і крута павярнуў у строй.

— Абармот! Ты што робіш? У цябе галава на плячах ці кацялок нямыты?

— А чаго яна брэша?

— Не тваё дзела! Ану, лезь цяпер, даставай!

Лезці за канаву баец, аднак, не хацеў і памалу забіраў убок, далей ад камандзіра чужога ўзвода. Пулька некалькі разоў сунулася ў макрэдзь, але скрозь было глыбока, і яна, павіскваючы, адскоквала назад. Тады Ванін рашуча сігануў у набрынялую снегам ваду і пераняў сабачанё на рукі.

— Дарма, — сказаў Ананьеў. — Трэба б таго абармота прымусіць.

Ён, як гэта часта рабіў, неяк раптам павярнуўся і, нібы забыўшы пра ўсіх, хутка пакрочыў па дарозе.

На хаду ўжо нас дагнаў Ванін, тулячы пад ватоўкай мокрую Пульку, якая адразу сцішылася там, вытыркнуўшы з-за пазухі маленькую чорную мордачку і дзве мокрыя лапкі. Узводны не паспеў яшчэ абазвацца, як

# 1

— Усё. Спрачацца не будзем, стройце людзей! — сказаў Іваноўскі Дзюбіну і выйшаў з-за вугла пуні.

Даўганогі, худы і нязграбны ў сваім белым абвіслым маскхалаце старшына Дзюбін памкнуўся нешта сказаць, але змоўчаў; у снегавым змроку блізкае ночы было відаць, як незадаволена перасмыкнуўся яго цёмны ад сцюжы і ветру, заўчасна зморшчаны твар. Пасля кароценькай паўзы, якая засведчыла яго маўклівую нязгоду з лейтэнантам, старшына рэзка ступіў па ледзьве азначанай у снезе сцяжынцы да старанна прычыненых дзвярэй пуні. Цяпер ужо зачыняць іх не было патрэбы, шырокім размашыстым рухам Дзюбін адкінуў дзверы, і тыя коса загойдаліся на адной завесе.

— Пад'ём! Выхадзі строіцца!

Іваноўскі, стоячы побач, прыслухаўся. Нягучная размова ў пуні адразу заглухла, усё там сціхла, нібы загіпнатызаванае гэтай, па сутнасці, такой звычайнай армейскай камандай, якая цяпер азначала для ўсіх надта многае. Праз імгненне, аднак, усё там заварушылася, зашамацела, пачуліся галасы, і вось ужо нехта першы выйшаў з дзвярэй на чыстую вечаровую белізну снегу. «Півавараў», — задумліва адзначыў сабе Іваноўскі, убачыўшы белую фігуру байца ў новенькім маскхалаце на фоне цёмнага бярвення сцяны. Аднак лейтэнант тут жа і забыўся пра яго, агорнуты ўласнымі клопатамі і слухаючы загадныя вокрыкі старшыны ў пуні.

— Хутка выходзь! І нічога не забываць: вяртацца не будзем! — глухавата даносіўся праз дзверы заклапочана-буркатлівы голас Дзюбіна.

Старшына відавочна злаваўся, так і не пагадзіўшыся з лейтэнантам, хоць амаль нічым і не выказваў гэтае сваёй нязгоды. Але хай! Злавацца сабе Дзюбін мог колькі хацеў, гэта яго асабістая справа, але пакуль тут камандуе ён, лейтэнант Іваноўскі, яму і рашаць. А ён ужо і рашыў — канчаткова і беспаваротна: пераходзіць перадавую будуць тут і цяпер, таму што колькі можна адкладваць! І так ён чакаў амаль шэсць сутак — было зусім блізка, якіх трыццаць кіламетраў, стала шэсцьдзясят — толькі што мераў па карце; на мясцовасці, вядома, набярэцца і болей. Праўда, у канцы лістапада ноч доўгая, але ўсё ж надта многа ўскладвалася на гэтую адну ноч, каб неразумна губляць такі дарагі цяпер для іх час.

Лейтэнант рашуча ўзяў прыслоненую да сцяны звязку лыж — сваю звязку — і адышоўся са сцежкі ў снег — на тры крокі наперадзе групы. Байцы таропка разбіралі лыжы, нацягвалі на галовы капюшоны; вецер з-за вугла злосна тузаў тонкую бязь маскіровачных халатаў і ляскаў па грудзях даўгімі канцамі завязак. Як Іваноўскі ні выкідваў усё лішняе, грузу набралася занадта, і ўсе дзевяць байцоў выглядалі цяпер нязграбна-няўклюднымі ў сваіх тоўстых ватоўках, абвешаных пад маскхалатамі рэчмяшкамі, гранатнымі сумкамі, падсумкамі і патранташамі. У дадатак да ўсяго яшчэ і лыжы, якія былі пакуль што груваcткім цяжарам, не больш. Але ўсё было неабходна, а лыжы, якія здаваліся цяпер непатрэбнымі, вельмі спатрэбяцца потым, у нямецкім тыле, — на лыжы ў яго была ўся надзея. Гэта менавіта ён прапанаваў там, у штабе, паставіць групу на лыжы, і яго ідэю адразу і ахвотна адобрылі ўсе, ад флегматычнага начальніка аддзела разведкі да прыдзірлівага, строгага начальніка штаба.

Іншая справа, як яе выкарыстаць, гэтую ідэю.

Менавіта гэта болей за іншае турбавала цяпер лейтэнанта, пакуль ён маўкліва, са стоеным нецярпеннем чакаў пастраення групы. У снежным паўзмроку байцы

разбіралі лыжы і, глуха пастукваючы імі, цесна месціліся на вузкай сцяжынцы. Як яны пакажуць сябе на лыжах? Не было часу як след праверыць усіх на лыжні, набліжаліся да перадавой завідна, сагнуўшыся, прабіраліся ў кустоўі. З раніцы ён праседзеў на НП камандзіра тутэйшага стралковага батальёна — назіраў за праціўнікам. Увесь дзень з нізкага хмарнага неба сыпаў рэдкі сняжок, пад вечар сняжок пагусцеў, і лейтэнант узрадаваўся. Ён ужо выгледзеў увесь маршрут пераходу, запомніў на ім кожную купіну, і тут пайшоў снег, — што можа быць лепш! Але як толькі пачало змяркацца, вецер павярнуў убок, снегапад стаў меншаць і амаль перастаў зусім, толькі рэдзенькія сняжынкі нesліся ў сцюдзёным паветры, слепа натыкаючыся на патрэсканыя сцены пуні. Старшына прапанаваў пачакаць пару гадзін, можа, завея зноў разгуляецца. У завею яны б управіліся куды як лепш...

— А калі не разгуляецца? — рэзка перапытаў яго Іваноўскі. — Тады што ж? Паўночы — кату пад хвост? Так, ці што?

Паўночы траціць не выпадала, увесь іх шлях быў разлічаны менавіта на поўную ноч. Зрэшты, старшыне нельга было адмовіць у разважлівасці — калі пераход сарвецца, не спатрэбіцца і самая поўная, самая доўгая ноч.

Правафланговым на сцежцы стаяў сяржант Лукашоў, з кадравых — плячысты маўклівы дзяцюк, сапраўдны працаўнік-пехацінец, памочнік камандзіра ўзвода, спецыяльна адкамандзіраваны з батальёна аховы штарма на гэта заданне. Ва ўсім яго аблічы, нетаропкіх і дакладных рухах было нешта ўпэўненае, дужае і надзейнае. Побач уладкоўваўся на сцяжыне таксама ўзяты з стралкоў баец Хакімаў. Хоць яшчэ і не было ніякай каманды, на смуглявым твары яго з цёмнымі бровамі ўжо з'явілася ўвага да камандзіра; вінтоўка ў адной руцэ, а лыжы ў другой роўненька стаялі ля ног. Поплеч з ім, папраўляючы сваю ношу ўзрыўчаткі, стаў баец Суднік, малады яшчэ